# Спартыўнае мерапрыемства “Вясёлыя старты Гродзеншчыны”, прымеркаванае да 75-годдзя Гродзенскай вобласці

03 мая 2019г. у спартыўнай зале ДУА СШ №2 г. Ашмяны сабраліся на спартландыю "Вясёлыя старты Гродзеншчыны", прымеркаваную да 75-годдзя ўтварэння Гродзенскай вобласці. У спартыўным спаборніцтве удзельнічалі дзве каманды «Сіла» і «Палёт». Удзельнікамі каманд былі наведвальнікі аддзяленняў дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту г.Ашмяны і г. Смаргонь і навучэнцы 5-га класа сярэдняй школы №2 г. Ашмяны. У зале панаваў запал, спартыўны азарт, натхненне і актыўная падтрымка балельшчыкаў. Дарослыя і дзеці з энтузіязмам выконвалі розныя заданні, падтрымлівалі адзін аднаго, імкнуліся толькі да перамогі. А ў выніку перамагла дружба, усё паказалі выдатны вынік і былі проста малайцы.

Гэта было яркае, эмацыйнае відовішча - свята радасці, здароўя, поспеху.







